ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
Магілёўскага гарвыканкама
_____________А.А. Галушка

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні гарадскога конкурсу
дзіцячай і юнацкай творчасці
“На пачатку дарог”, прысвечанага
90-годдзю Уладзіміра Караткевіча

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Гарадскі конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці “На пачатку дарог” (далей – Конкурс) праводзіцца з мэтай стварэння ўмоў для рэалізацыі творчага патэнцыялу навучэнцаў, выяўлення і падтрымкі таленавітай моладзі, папулярызацыі творчасці Уладзіміра Караткевіча, патрыятычнага выхавання моладзісродкаміроднаймовы.

## 2. АРГАНІЗАТАРЫ КОНКУРСУ

Арганізатары Конкурсу –дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці “Эверэст” г.Магілёва”, Магілёўскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, Магілёўскі гарвыканкам.

Арганізатарамі Конкурсу ствараецца аргкамітэт, у функцыі якога ўваходзіць прыём і апрацоўка заявак на ўдзел у Конкурсе, абранне і зацвярджэнне членаў журы (не менш чым за 5 дзён да правядзення Конкурсу), падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў Конкурсу.

## 3. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

Да ўдзелу ў Конкурсе запрашаюцца дзеці і моладзь г.Магілёва ва ўзросце ад 6 да 31 года ўключна.

## 4. УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

Тэрмін правядзення Конкурсу - **з 28 кастрычніка па 28лістапада 2020** года. Форма правядзення – дыстанцыйная.
Узнагароджанне пераможцаў адбудзецца **28 лістапада 2020** года.

Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

4.1. Уласная паэзія.

У гэтай намінацыі выканаўцы прадстаўляюць твор уласнага сачынення. Тэматыка вершаў: грамадзянска-патрыятычная, філасофская, пейзажная, вершы, прысвечаныя творчасці або жыццю У.Караткевіча.Творы прымаюццана рускай і беларускай мовах. Тэкст паэтычнага твора высылаецца разам з заяўкай у адным экзэмпляры.

4.2. Мастацкае слова.

У дадзенай намінацыі Конкурс праводзіцца па наступных формах: калектыўнае выкананне і індывідуальнае выкананне.

Удзельнікі прадстаўляюць відэазапіс твораў У.Караткевіча розных жанраў (урыўкі з раманаў або апавяданняў на беларускай мове, вершы). Працягласць відэазапісу – да 5-7 хвілін.

4.3 Тэатральная пастаноўка.

Удзельнікі па напрамку "Тэатральная пастаноўка" прадстаўляюць відэазапіс пастаноўкі па творчасці У.Караткевіча на беларускай мове. Працягласць відэазапісу – да 10 хвілін.

4.4. Малюнкі.

Удзельнікі па напрамку "Малюнкі" прадстаўляюць уласны малюнак па творчасці У.Караткевіча.

4.5 Відэаролік.

Удзельнікі па напрамку "Відэаролік" прадстаўляюць уласны відэаролік, прысвечаны творчасці У.Караткевіча, дапускаецца музычнае суправаджэнне або агучванне. Працягласць відэазапісу - да 5 хвілін.

Удзельнікі ва ўсіх намінацыях ацэньваюцца па ўзроставых катэгорыях: дзеці (6-14 гадоў), падлеткі (12-18 гадоў), моладзь (18-31 год).

Узрост удзельніка вызначаецца на момант правядзення Конкурсу. Пры ўзнікненні спрэчнай сітуацыі члены журы маюць права запатрабаваць дакумент, які пацвярджае ўзрост удзельніка.

Заяўкі на ўдзел у Конкурсе і конкурсныя матэрыялы неабходна накіраваць да **20 лістапада 2020 года** на электронны адрас дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі "Цэнтр творчасці "Эверэст" г.Магілёва" ddut-everest@tut.by з паметкай "На пачатку дарог" па наступнай форме:

ЗАЯЎКА
на ўдзел у гарадскім конкурсе дзіцячай і юнацкай творчасці
"На пачатку дарог"

| Намінацыя/ напрамак/форма/ узроставая катэгорыя | Прозвішча, імя канкурсанта або назва калектыву | Назва твора, аўтар | Узрост (дата, месяц, год нараджэння) | Час выканання | Тэлефон |
|---|---|---|---|---|---|

Заяўка афармляецца на беларускай мове (у альбомным фармаце Word, шрыфт –TimesNewRoman, памер шрыфту – 12)

Заяўкі, дасланыя пасля ўказанага тэрміну, не разглядаюцца.

Тэлефон для даведак 77-60-93 (Самусенка Марыя Аляксандраўна).

## 5. ТЭХНІЧНЫЯ ЎМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

Конкурс праводзіцца дыстанцыйна.

Усе медыяфайлы выканаўцаў высылаюцца на электронны адрас Цэнтра творчасці ddut-everest@tut.by з паметкай "На пачатку дарог". Матэрыялы, дасланыя пасля 20.11.2020, разглядацца не будуць.

## 6. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ

Адзнака выступлення ўдзельнікаў праводзіцца па наступных крытэрыях:

адпаведнасць рэпертуару ўзроставым асаблівасцям выканаўцаў;
артыстызм і сцэнічная культура;
захаванне часовага рэгламенту;
выкананне ўмоў Конкурсу;
адпаведнасць тэматыцы Конкурсу;
узровень мастацкага і тэхнічнага выканання і майстэрства.

**Пераможцы вызначаюцца па наступных напрамках:**

- уласная паэзія;
- мастацкае слова, індывідуальнае выкананне;
- мастацкае слова, калектыўнае выкананне;
- тэатральная пастаноўка;
- малюнкі;
- відэаролік.

Члены журы маюць права прысуджаць Гран-пры ў кожнай з намінацый, а таксама павялічваць або памяншаць колькасць прызавых месцаў. Па выніках конкурсу можна задаць пытанні членам журы.

Рашэнне журы канчатковае і абскарджанню не падлягае. Ацэначныя балы паводле конкурсных пратаколаў не выносяцца на ўсеагульнае абмеркаванне.

Прозвішчы пераможцаў Конкурсу будуць размешчаны на сайце дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі "Цэнтр творчасці "Эверэст" г.Магілёва" 27 лістапада 2020.

Пераможцы конкурсу запрашаюцца на ўзнагароджванне, якое адбудзецца 28 лістапада 2020 года ў ДУДА "Цэнтр творчасці "Эверэст" г.Магілёва" (пр-т Дзімітрава 65а).

Пераможцы, якіязанялі 1, 2, 3 месцы, узнагароджваюцца дыпломамі і сувенірамі.

## 7. ФІНАНСАВАННЕ

Выдаткі на арганізацыю і правядзенне Конкурсу ажыццяўляюцца за кошт сродкаў дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі "Цэнтр

творчасці “Эверэст” г. Магілёва”, Магілёўскага гарвыканкама, Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Камерцыйныя і некамерцыйныя арганізацыі, прыватныя прадпрымальнікі могуць выступаць спонсарамі і партнёрамі конкурсу, засноўваць спецыяльныя прызы па ўзгадненні з аргкамітэтам.

## 8. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Інфармацыя аб правядзенні Конкурсу размешчана на афіцыйным сайце дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці “Эверэст”г. Магілёва” (эверест.бел) у раздзеле “На пачатку дарог”.

Аргкамітэт мае права размяшчаць на сваім сайце фотаздымкі з Конкурсу і выкарыстоўваць іх у рэкламнай прадукцыі без папярэдняй згоды з калектывам або асобным выканаўцам.

Аргкамітэт не нясе адказнасці за наяўнасць правоў на выкарыстанне заяўленых канкурсантамі твораў, а таксама за якасць фанаграм.

Арганізатары забяспечваюць прафесійныпадыходда адбору ўдзельнікаў Конкурсу, пакідаюць за сабой права ўнясення ў дадзенае Палажэнне змяненняў і дапаўненняў, аб чым у тыднёвы тэрмін пасля прыняцця рашэння праінфармуюць удзельнікаў Конкурсу.

Дырэктар дзяржаўнай ўстановы
дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці
“Эверэст” г. Магілёва” І.В.Галоднікава

УЗГОДНЕНА
Начальнік аддзела ідэалагічнай работы
і па справах моладзі Магілёўскага гарвыканкама
І.А.Бацішчава

Начальнік упраўлення па адукацыі
Магілёўскага гарвыканкама
І.Л.Рыбакова

Начальнік упраўлення культуры
Магілёўскага гарвыканкама
М.В.Клепчукова

Старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі
А.М.Казека